Пролетары ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 234 (303)
СЕРАДА 9 КАСТРЫЧНІКА 1940 г.

Цана 10 капеек.

ПАСПЯХОВА ЗАКОНЧЫЦЬ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫЯ РАБОТЫ

Заканчваецца сельскагаспадарчы год. 1940 год увойдзе ў гісторыю працоўных сялян, як самая радасная, самая яркая старонка ў іх жыцці. Гэта быў першы год, калі дзесяткі тысяч сялянскіх гаспадарак упершыню атрымалі магчымасць працаваць не на памешчыцкай, а на сваёй зямлі, якая ім перадана совецкай уладай.

З вялікім натхненнем працавалі працоўныя сяляне вясной у час сяўбы, улетку ў час уборкі. І зямля шчодра ўзнагародзіла людзей за чэсную працу. Асабліва вялікіх поспехаў дабіліся нашы маладыя калгасы. Як правіла, калгасны ўраджай вышэй, чым у аднаасобных сялянскіх гаспадарках. Многа калгасаў нашай абласці выдадуць на працадзень калгаснікам па 6—8 і больш кілограмаў хлеба, па пуду бульбы і па 3—4 рублі грашыма.

Але сельскагаспадарчы год яшчэ не скончан. Большасць калгасаў яшчэ не закончылі малацьбу. Убрана няпоўнасцю больш паловы бульбы. Калі неадкладна не прыняць усе меры к завяршэнню сельскагаспадарчых работ, то планіруемыя даходы могуць зменшыцца ў выніку страт, што зможа ўдарыць па калгасу і па самых калгасніках.

У радзе раёнаў старшыні калгасаў лічаць, што з малацьбой нечага спяшыць: — малаціць можна будзе зімой. Так мяркуе, напрыклад, старшыня калгаса імені 22-й гадавіны РСЧА, Гродненскага раёна, тав. Салей. Такія настроі некаторых кіраўнікоў калгасаў ёсць не што іншае, як імкненне кіраваць калгасам такімі метадамі, як гэта рабілася ў аднаасобнай гаспадарцы.

Як абстаялі і абстаяць справы ў аднаасобніка? Убраўшы ўраджай, склаўшы ў гумно, намалаціўшы на першы час колькі трэба хлеба, ён потым сабе малоціць па меры неабходнасці, а ў гэты час ураджай, малоцячь грызуны, па зярнятку расцягваюць яго статі птушак. Аднаасобніку не патрэбен дакладны ўлік, ён падлічыць колькі конный заявяне, вызначыць на вока свой «валавы збор» і плануе, на колькі ў яго хапае хлеба і колькі трэба будзе яшчэ дастаць.

Такімі метадамі нельга кіраваць у калгасе. Калгас—гэта складаная гаспадарка. Калгас, дзякуючы сваёй арганізаванасці, дзякуючы дапамозе, якая яму аказваецца машынна-трактарнай станцыяй, мае ўсе магчымасці своечасова спраўляцца з усімі работамі. У калгасе патрэбен не ўчот на вока, а дакладны ўчот даходаў. Усяго гэтага можна дабіцца, калі хлеб ляжыць не ў скірдах, а ў свірнах. Вось чаму трэба асудзіць традыцыю, што малаціць трэба зімой, і неадкладна паўсямесна завяршыць малацьбу, выкарыстоўваючы для гэтага складаныя малатарні МТС, а таксама конныя малатарні калгасаў.

Не менш важнае пытанне—гэта пытанне аб уборцы бульбы. Ураджай бульбы ў гэтым годзе ўдаўся на славу. Мы павінны дабіцца, каб уся бульба была ўбрана, каб ні адна клубня не асталася ў зямлі. Аднак, трэба сказаць, што ёсць пагроза, што частка бульбы можа загінуць, калі па-сапраўднаму не арганізаваць справу з уборкай.

Вось прыклад. Калгасу імені Сталіна, Ізабелінскага сельсовета, Ваўкавыскага раёна, трэба яшчэ ўбраць каля 30 га бульбы, а ўбіраюць тут у сярэднім за дзень 2 гектары. Значыць, прыдзецца яшчэ ўбіраць дзён пятнаццаць. А к гэтаму часу таго і глядзі — ударыць марозы. Чаму гэты і іншыя калгасы адцягваюць з уборкай бульбы? Па-першае, на ўборцы бульбы няма індывідуальнай здзельшчыны; па-другое, рад калгаснікаў, асабліва жанчын, не выходзяць на работу, а, па ўстанавіўшыхся традыцыях, уборка бульбы — гэта ў асноўным жаночая работа. Зараз, калі рашаецца поспех закончэння сельскагаспадарчага года, калі кожны дзень, як гавораць, год корміць,—нельга дапусціць, каб хто-небудзь з членаў калгаса не ўдзельнічаў у калгаснай рабоце.

У раёнах нашай абласці яшчэ не закончана такая важная работа, як падняцце зябліва. Асабліва адстаюць у гэтых работах Крынкаўскі, Скідзельскі, Свіслацкі і Ваўкавыскі раёны. Зябліва—гэта фундамент будучага ўраджаю. Зябліва палягчае правядзенне вясенніх сельскагаспадарчых работ. Добры кіраўнік калгаса, добры гаспадар, які глядзіць уперад, клапоціцца аб тым, каб у будучым годзе калгасны ўраджай яшчэ больш ўраджай, — не дапусціць таго, каб у яго калгасе быў сарван план зяблевага ворыва. Такі кіраўнік калгаса прымусіць праз адзінаасобныя арганізацыі, каб МТС выканала план падняція зябліва. Ён знойдзе і сваю рабочую і цяглавую сілу, каб не пераключыць на зябліва.

Нашым кіраўнікам калгасаў, нашым калгаснікам трэба не забываць, што за іх работай, за іх поспехамі сочаць аднаасобнікі. Бо аднаасобнік так мяркуе: добрыя справы ў калгасе, і я стану калгаснікам; дрэнныя справы — я яшчэ падумаю.

Старшыня калгаса імені Першага мая, Кнышынскага раёна, т. Бартноўскі расказвае, што аднаасобнікі, даведаўшыся аб тым, што калгас выдаў толькі авансам па 5 кілограмаў хлеба, зайздросцяць калгасным поспехам. Гэта добра! Але трэба дабіцца, каб кожны калгас быў узорным, каб ён сваімі поспехамі агітаваў за калгаснае будаўніцтва. І гэтага ён можа і абавязан дабіцца. Вось чаму паспяховае завяршэнне ўсяго цыкла работ сельскагаспадарчага года ёсць не толькі гаспадарчая, але і важная палітычная задача. Гэта павінны памятаць кіраўнікі калгасаў, а таксама і кіраўнікі раённых арганізацый.

ЗАКРЫЎСЯ XIV З'ЕЗД КОМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

МІНСК, 7 кастрычніка. (ТАСС). У спрэчках па справаздачных дакладах ЦК комсамола Беларусі і рэвізійнай камісіі выказаўся 31 дэлегат. З прамовамі выступілі сакратар ЦК КП(б) Беларусі тав. Панамарэнка, сакратар ЦК ВЛКСМ тав. Наседкін і старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета Беларусі тав. Наталевіч.

З'езд прызнаў палітычную лінію ЦК ЛКСМ Беларусі правільнай, практычную работу — здавальняючай.

З'езд заслухаў і зацвердзіў даклад Мандатнай камісіі. Сярод 518 дэлегатаў з'езда — тры Героі Совецкага Саюза, 18 дэпутатаў Вярхоўных Советаў СССР і БССР і 117 дэпутатаў мясцовых Советаў дэпутатаў працоўных.

З вялікім уздымам дэлегаты з'езда прынялі прывітанні таварышам Сталіну і Молатаву.

Сёння на ранішнім пасяджэнні з'езда абмяркоўваліся кандыдатуры для тайнага галасавання ў састаў Цэнтральнага Камітэта ЛКСМ Беларусі і ў састаў рэвізійнай камісіі.

На вячэрнім пасяджэнні адбыліся выбары. Пасля аглашэння рэзультатаў тайнага галасавання з'езд закончыў сваю работу.

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

Прыбыцце германскіх войск у Румынію

НЬЮ-ЁРК, 7 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, па манаўчыскіх звестках, за апошнія 24 гадзіны ў Румынію прыбыло «4 або 5 эшалонаў» з германскімі войскамі, уключаючы і матарызаваныя часці. Чакаецца прыбыцце новых германскіх войск.

На паведамленню берлінскага карэспандэнта агенцтва Юнайтэд Прэс, румынская дыпламатычная місія пацвердзіла звесткі аб прыбыцці германскіх войск у Румынію «з мэтай рэарганізацыі і абучэння румынскай арміі». Карэспандэнт указвае, што, як заявілі ў румынскай дыпламатычнай місіі, у Румынію чакаецца прыбыццё значнай колькасці італьянскіх войск для аказання дапамогі ў абучэнні румынскіх салдат.

ПРАЦОЎНЫЯ НАШАЙ АБЛАСЦІ АДНАДУШНА АДАБРАЮЦЬ УКАЗ АБ СТВАРЭННІ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРАЦОЎНЫХ РЭЗЕРВАЎ СССР

Слова калгаснікаў

ГРОДНА. (Ад нашага карэспандэнта). Калгаснікі Гродненскага раёна з вялікай радасцю сустрэлі Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета аб дзяржаўных працоўных рэзервах.

Зараз па калгасах праходзіць абмеркаванне гэтага Указа. Даведаўшыся аб Указе, моладзь Вярцелішскага сельсовета з велізарным уздымам выказала сваё жаданне паступіць у рамесленыя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння.

У гутарцы з карэспандэнтам «Вольнай працы» старшыня Вярцелішскага сельсовета тав. Волкаў паведаміў:

— Моладзь і старыя калгаснікі нашага сельсовета сустрэлі Указ аб дзяржаўных рэзервах і загад Галоўнага Упраўлення працоўных рэзерваў пры СНК СССР з надзвычайнай радасцю і ўздымам. Мерапрыемствы партыі і ўрада аб стварэнні працоўных рэзерваў краіны соцыялізма аднадушна адабраюць усімі калгаснікамі і аднаасобнікамі.

У памяшканне сельсовета штодзённа прыходзіць моладзь з заявамі аб сваім жаданні паступіць у школы, каб набыць вытворчую спецыяльнасць.

Вось з калгаса імені Леніна прышлі 17-гадовы Нікалай Кірко і 15-гадовы Васілій Кавальчук. Яны заявілі: «Партыя, Урад і асабіста таварыш Сталін праяўляюць вялікія клопаты аб рабочай і калгаснай моладзі. У рамесленых вучылішчах, у школах фабрычна-заводскага абучэння ствараюць усе ўмовы для таго, каб атрымаць спецыяльнасць і чэсна працаваць на карысць сваёй радзімы. Мы жадаем вучыцца ў такіх школах і на клопаты дзяржавы адказаць выдатнай вучобай».

Аб сваім жаданні вучыцца заяўляюць дзеці аднаасобнікаў — бедняков і серадняков. У сельсовеце ўжо зарэгістравана 15 маладых патрыётаў, якія прыходзяць сюды, каб паехаць на вучобу ў школы.

Абмяркоўваючы Указ, старшыня калгаса імені 24 сакавіка, Жукевіцкага сельсовета, тав. Жытала сказаў:

— На вучобу ў школу калгас накіруе сваю лепшую моладзь. З радасцю я пасылаю сваіх двух сыноў — Еўгенія і Эдуарда. Няхай вучацца, набываюць кваліфікацыю. Яны будуць больш карыснымі нашай радзіме. У будучым годзе пашлю свайго трэцяга сына — Станіслава.

Г. Лупсякоў.



Народны Камісарыят лёгкай прамысловасці СССР узнагародзіў значком «Выдатнік соцыялістычнага спаборніцтва лёгкай прамысловасці» лепшага рабочага беластоцкай швейнай фабрыкі «Атэлье мод» стаханаўца М. Я. Шустэра. На здымку: на рабочым мітынгу стахановец І. А. Мадзілінскі (справа) ад імені калектыва віншуе тав. Шустэра з узнагародай. Фота А. Сапіра.

Своечасовы закон

Выданы Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР Указ аб дзяржаўных працоўных рэзервах зусім своечасовы і неабходны. Ён накіраван на ўмацаванне гаспадарчай і абароннай магутнасці нашай радзімы.

Пройдзе нямнога часу, і наша соцыялістычная прамысловасць атрымае новае папаўненне з ліку сконччыўшых школы фабрычна-заводскага абучэння. Наша краіна будзе мець новы рэзерв кваліфікаваных рабочых, якія вельмі неабходны для нашай прамысловасці.

Я працую брыгадзірам інструментальнага цэха паравознага дэпо. На вытворчасці з 1900 года. За гэтыя чатыры дзесяткі год на сваёй уласнай спіне адчуў гнёт і царскага самаўладства, і польскіх паноў.

Памятаю, як мне прышлося набываць кваліфікацыю. 14-гадовым юнаком мяне аддалі вучыцца на кавале. Аб гэтай вучобе расказваць не стану. Скажу толькі, што з трох год, адданых вучобе, толькі 6 месяцаў былі скарыстаны для набыцця кваліфікацыі. Астатні-ж час мяне скарыстоўвалі на «пабягушках», і калі набыў сабе кваліфікацыю, маё жыццё не стала лепшым.

Толькі пры совецкай уладзе я адчуў, што са мною лічацца, цэняць маю працу.

У мяне ёсць 14-гадовы сын. Ён любіць чыгуначную справу. З ахвотай пашлю яго ў чыгуначнае вучылішча.

Д. Мініцюк,
брыгадзір інструментальнага цэха Беластоцкага дэпо.

У час перапынку

Інструментальны цэх. Навокал акуратна ўкладзены інструменты: малаткі, ключы розных калібраў і т. д. Сюды сабраліся рабочыя механічнага цэха, каб паслухаць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах. Хаця некаторыя з удзельнікаў ужо раней паспелі азнаёміцца з выданым Указам, тым не менш яны прышлі на чытку з ахвотай.

Чытка скончана. Майстар цэха тав. Бейнар пытае, што каму не ясна.

Пачынаецца гутарка, звычайная, таварыская.

— Вось я скажу некалькі слоў,— гаворыць майстар тав. Бейнар.

І ён расказвае аб бязрадасным лёсе моладзі ў былой панскай Польшчы.

— Раней — кажа ён, — выхоўваеш сына, а калі трохі падрасце, ён становіцца беспрацоўным.

І тут-жа ён напамінае ўдзельнікам гутаркі аб тым, як маладыя людзі пры панаванні памешчыкаў і капіталістаў, не знаходзячы працы ў былой Польшчы, накіроўваліся ў пошуках шчасця ў іншыя краіны. Але і там становішча было не лепшае.

— У нас-жа ўсім хопіць работы, — заканчвае тав. Бейнар.

Гутарка ахапіла ўсё большы лік удзельнікаў. Праўда, некаторыя з іх не выступаюць, але па іх заўвагах відаць, што яны зразумелі сутнасць Указа.

Кароткі быў расказ рабочага меднікаваў тав. Заечкоўскага. Ён расказаў як цяжка жылося яму пры ўладзе памешчыкаў і капіталістаў.

— Бацька мой, — кажа ён, — адвечны чыгуначнік, і не гледзячы на гэта, я дзесяць год падрад не мог знайсці пастаяннай работы і лічуся сезонным.

Гутарка скончана. Пачуўся гудок. Людзі зноў узяліся за свае справы.

І. Давыдаў.

АГІТАТАРЫ РАСТЛУМАЧВАЮЦЬ УКАЗ

ЗАМБРАЎ. (Па тэлефону). Працоўныя Замбраўскага раёна горача вітаюць мерапрыемствы совецкага ўрада па стварэнню дзяржаўных працоўных рэзерваў. На прадпрыемствах і ў вёсках праводзяцца мітынгі і сходы, на якіх абмяркоўваецца Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і пастанова Соўнаркома аб прызыве гарадской і калгаснай моладзі ў ствараемыя вучылішчы і школы.

Райком партыі накіраваў у вёскі і на прадпрыемствы таварышоў з раённага партыйнага і комсамольскага актыва і агітатараў для растлумачэння Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і пастановы Совета Народных Камісараў Саюза ССР.

Створана камісія для правядзення прызыву гарадской і калгаснай моладзі ў рамесніцкія вучылішчы, чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння.

Па Совецкай краіне

ПАДРЫХТОЎКА ДА 15-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ М. В. ФРУНЗЕ.

У Чырвонасцяжнай і ордэна Леніна Ваеннай акадэміі імені Фрунзе шырока разгарнулася падрыхтоўка да 15-годдзя з дня смерці Міхаіла Васільевіча Фрунзе (31 кастрычніка гэтага года). На ўсіх курсах, факультэтах і ў падраздзяленнях акадэміі праводзяцца даклады і гутаркі аб баявой, рэвалюцыйнай дзейнасці выдатнага пралетарскага палкаводца. 30—31 кастрычніка адбудзецца вечар успамінаў удзельнікаў грамадзянскай вайны, прысвечаны М. В. Фрунзе.

У кабінеце імені Фрунзе размешчаны фатаграфіі, копіі загадаў і схем баявых аперацый, праведзеных пад кіраўніцтвам М. В. Фрунзе ў годы грамадзянскай вайны. Асаблівую цікавасць прадстаўляюць знойдзеныя ў архіве яшчэ неапублікаваныя дакументы: тэлеграма тав. Фрунзе на імя тав. Чапаева ад 9 чэрвеня 1919 года, пасланая з станцыі Чышмы, у якой ён дзякаваў Чапаеву і байцам яго дывізіі за паспяховае фарсіраванне ракі Белай і разгром белагвардзейскіх полчышч Калчака пад Уфой; загад па Туркестанскаму фронту аб скарыстанні ручных гранат (яшчэ ў 1919 годзе тав. Фрунзе патрабаваў, каб кожны чырвонаармеец быў «абучан кіданню гранат на ўказаную адлегласць з становішча стоячы, з калена і лежачы на зямлі, так і з-за ўсякага мясцовага прадмета, забора, даху») і загад аб узаемадзеянні пяхоты з артылерыяй і аб узаемнай таварыскай выручцы ў баі.

(ТАСС).



У сталіцу БССР — Мінск прыехаў «дзядуля» рускай авіяцыі, заслужаны лётчык СССР ордэнаносец Б. І. Расінскі. Ён прачытае рад лекцый і дакладаў аб гісторыі рускай авіяцыі. На здымку: Барыс Іліадоравіч Расінскі сярод студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Фота Б. Вернера. Фотахроніка БЕЛТА.

20-ГОДДЗЕ ВЫЗВАЛЕННЯ ЗАБАЙКАЛЛЯ АД ІНТЭРВЕНТАЎ

ЧЫТА. 21 кастрычніка працоўныя Чыцінскай абласці адзначаюць 20-годдзе вызвалення Забайкалля ад інтэрвентаў і белагвардзейцаў.

На заводах, фабрыках, залагах прысках, у калгасах і ва ўстановах рыхтуюцца да гэтага свята. Наладжваюцца гутаркі былых чырвонаармейцаў, чырвоных партызан — удзельнікаў барацьбы за вызваленне Забайкалля, чытаюцца даклады аб поспехах соцыялістычнага будаўніцтва ў вобласці.

Абласны краязнаўчы музей рыхтуе выстаўку. Выдаюцца два юбілейныя зборнікі — «Чыцінская вобласць за 20 год» і «Успаміны удзельнікаў грамадзянскай вайны ў Забайкаллі».

МАСТАЦКІ НАСТАЎНІЦКІ ІНСТЫТУТ.

У Маскве на базе курсаў рысавання і чарчэння адкрыўся мастацкі настаўніцкі інстытут. Ён будзе рыхтаваць настаўнікаў рысавання і чарчэння для сярэдняй школы.

Тэрмін навучання — два годы. На першы курс прынята 68 чалавек.

ПРАЦОЎНЫЯ СОВЕЦКАЙ ЛІТВЫ УКЛЮЧАЮЦЦА У ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СПАБОРНІЦТВА

КАЎНАС. Тысячы рабочых Каўнаса і іншых гарадоў Совецкай Літвы ўключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва ў часць XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. На кожным заводзе і фабрыцы ідзе дзейная падрыхтоўка да вялікага свята, падвіцца магчымасці новага павышэння прадукцыйнасці працы.

На шматлікіх сходах рабочыя, інжынеры, тэхнікі, служачыя прымаюць на сябе канкрэтныя абавязацельствы. Шырыцца перадкастрычніцкае спаборніцтва і ў Вільнюсе. Спаборнічаюць на дастойную сустрэчу вялікага свята працоўныя папяровых фабрык, шакаладнай, піваварных заводаў, маслабойні і іншых прадпрыемстваў.

—0—

25 КІЛОГРАМАЎ БУЛЬБЫ НА ПРАЦАДЗЕНЬ

У калгасах Пружанскага раёна, Брэсцкай абласці, старанна прыбраны калгаснікаў на соцыялістычных палях завяван высокі ўраджай бульбы. У сярэднім з гектара калгаснікі ўбіраюць па 1000 пудоў бульбы. Калгас імені Сталіна атрымлівае ураджай з гектара па 1400 пудоў, «Чырвоны сцяг» — па 1100 пудоў.

За адданую працу калгаснікі, па папярэдніх падліках, атрымаюць на працадзень не менш чым па 25 кілограмаў бульбы.

У дапамогу прапагандысту і агітатару

АБ МАРАЛЬНЫМ ВОБЛІКУ СОВЕЦКАГА ГРАМАДЗЯНІНА

I.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя адкрыла новую эру ў гісторыі. Мільёны людзей пачалі будаваць новае, соцыялістычнае грамадства ў абстаноўцы найвялікшай разрухі, сярод неймаверных лішэнняў. Ужо першыя дні існавання гэтага новага свету паказалі маральную прыгожасць яго, прыцягальную яго сілу, творчую магутнасць, несакрушальную энергію. Соцыялістычная рэвалюцыя перарабіла адносіны паміж людзьмі — вытворчыя адносіны; яна стварыла новы маральны воблік совецкага грамадзяніна, яна выпрацоўвае новыя нормы паводзін, новую маральнасць — комуністычную.

Нормы паводзін, нормы маральнасці выпрацоўвае кожная грамадская фармацыя; кожнае грамадства стварае сваю мараль. Рабаўласнікі, феадалы, буржуазія для сваёй эпохі выпрацоўвалі сваю асобую класавую мараль, імкнуліся навязаць яе ўсяму грамадству, зрабіць агульнаабавязковымі нормы паводзін, нормы маральнасці, якія караняцца ў іх уласных матэрыяльных інтарэсах, і гэтыя класавыя, эксплаататарскія інтарэсы ахоўваюць.

Такавы, напрыклад, нормы паводзін, якія падтрымлівала ўсім сваім аўтарытэтам і асвятляла хрысціянская царква ў перыяд рабаўладання. — Рабы ды падпарадкуюцца панам сваім.

Гэта быў «катэгарычны імператыў», які прад'яўлялі рабаўласнікі да сваіх рабоў, каб увекавечыць свой лад, сваю ўладу над жыццём, працай і ўсім дастаяннем прыгнечаных мас. Вывучаючы любую рэлігійную сістэму, лёгка ўбачыць, што пануючыя класы той або іншай грамадскай фармацыі імкнуцца ўзаконіць іменем бога, рэлігі і нормы паводзін, якія патрэбны іменна гэтым класам і таму ўзводзяцца імі на вышыню «агульначалавечай» маралі. Дзесяць запаведзей біблії — гэта запаведзі, якія багатыя жывёлаводы, феадалы, землеўладальнікі прад'яўлялі ўсяму грамадству для таго, каб аградзіць свае інтарэсы.

Але ці магла падобная рабаўласніцкая мараль, мараль феадальнага ці наследваўшага за ім капіталістычнага грамадства стаць мараллю агульначалавечай, мараллю для ўсіх? Вядома, не, таму што гэта грамадства падзелена на непрымірыма варожыя класы, з антаганістычнымі інтарэсамі. Тое, што ў інтарэсах капіталістаў, або ў інтарэсах памешчыкаў, тое варожа народным масам, і народныя масы ніколі не маглі прымірыцца з навязваемай ім мараллю, выгаднай іх эксплаататарам.

Маркс і Энгельс у «Маніфесце Комуністычнай партыі» указвалі на тое, што буржуазія не аставіла паміж людзьмі ніякай іншай сувязі, акрамя голага інтарэса, бессардэчнага «чыстагана». У ледзяной вадзе эгаістычнага разліку патапіла буржуазія ўсе чалавечыя пачуцці. Яна «ператварыла асабістае дастоінства чалавека ў менавы кошт» і вышэй усякай свабоды паставіла адну «бессаромную свабоду гандлю». Буржуазія «пазбавіла свяшчэннага арэола ўсе роды дзейнасці, якія да гэтага часу лічыліся пачэснымі і на якія глядзелі з благагавейным трэпетам. Урача, юрыста, свяшчэнніка, паэта, чалавека навукі, яна ператварыла ў сваіх платных наёмных работнікаў. Буржуазія сарвала з сямейных адносін іх чулліва-сентыментальнае пакрыццё і звяла іх да чыста грашовых адносін». Яшчэ на зары капіталізма ідэолаг буржуазіі Гобс фармуліраваў звярыную «мараль» капіталізма: «Чалавек чалавеку — воўк». Прыгнечваць, бязлітасна эксплаатыраваць, біць адсталых і слабых—такі «воўчы закон» капіталізма.

Такава мараль буржуазіі, такі маральны воблік буржуа.

II.

«...Усякая тэорыя маралі з'яўлялася да гэтага часу ў канечным рахунку рэзультатам данага эканамічнага становішча грамадства. А так як грамадства да гэтага часу развівалася ў класавых процілегласцях, то мараль заўсёды была класавай мараллю: або яна апраўдвала панаванне і інтарэсы пануючага класа, або, калі прыгнечаны клас станавіўся дастаткова сільным, яна выражала абурэнне супроць гэтага панавання і абараняла будучыя інтарэсы прыгнечаных» (Энгельс).

Адначасова з маральным выраджэннем пануючых класаў у капіталістычным грамадстве на другім яго полюсе жылі людзі, якія прытрымліваліся іншых, не прагных, не драпежніцкіх, а сапраўды чалавечых поглядаў. У грамадстве, дзе дэвізам паноў было «вайна ўсіх супроць усіх», паявіліся людзі, якія імкнуліся выпрацаваць нормы паводзін, прыгодныя для ўсяго працоўнага чалавецтва.

Такімі ідэолагамі новага, будучага чалавецтва былі ў дамарксавую эпоху соцыялісты-утапісты. Але шлях да свабоды і шчасця, які яны ўказвалі, быў не прыгодны, утапічны. Толькі ў новую эпоху Маркс, Энгельс, Ленін, Сталін з'явіліся тварцамі сапраўды навуковай тэорыі соцыялізма і ўзброілі ёю перадавое чалавецтва.

Калі ў Расіі перадавыя рабочыя змагаліся супроць царызма, яны стварылі сваю большэвіцкую партыю, і дзеячы гэтай партыі аддавалі сябе цалкам справе народа. Яшчэ не было соцыялістычнай рэвалюцыі, яшчэ не было соцыялістычнага грамадства, яшчэ вісеў над народам гнёт памешчыкаў і капіталістаў, а гэтыя людзі, людзі будучага, правадыры самай рэвалюцыйнай партыі ў свеце, выхоўвалі ўжо тады носьбітаў новай маралі, маралі грамадзян соцыялістычнага грамадства.

Для большэвікоў вышэйшым законам жыцця, пранізваючым усю іх істоту, заўсёды былі і астаюцца інтарэсы партыі, інтарэсы соцыялізма, блага соцыялістычнай рэвалюцыі. Усе свае рашэнні партыя большэвікоў выпрацоўвала, кіруючыся іменна гэтым вышэйшым законам — благам рэвалюцыі. Увесь «кодэкс маралі» змагаючагася пролетарыята пранізан быў тымі-ж ідэямі, служыў тым-жа патрэбнасцям рэвалюцыйнай барацьбы. Блага рэвалюцыі, інтарэсы рэвалюцыі вызначалі паводзіны большэвіка, рэвалюцыянера, яго адносіны да сям'і, да жанчыны, да дзяцей, да дзяржавы, да іншых класаў.

Сурова, але разам з тым выдатна было жыццё Леніна, жыццё Якава Свердлова, Фелікса Дзержынскага, жыццё Ладо Кецхавелі, Сашы Цулукідзе, Івана Васільевіча Бабушкіна, Серго Орджанікідзе, Сергея Кірава, Міхаіла Фрунзе, Валерыяна Куйбышава і яшчэ многіх, ушоўшых ад нас. Выдатна, азаронае найвялікшымі гістарычнымі задачамі і гераічнай барацьбой, жыццё кіраўнікоў большэвіцкай партыі, якія сёння на чале з таварышом Сталіным накіроўваюць энергію народа на будаўніцтва новага чалавечага грамадства, дзе выпрацоўваюцца нормы соцыялістычнай маралі, якія павінны стаць і становяцца ўжо нормамі паводзін мільёнаў людзей.

Большэвікі афяравалі ўсім для таго, каб весці рэвалюцыйную работу. У імя рэвалюцыі іншым прыходзілася расставацца з жыццём на эшафоце, у засценках або гадамі весці ў нястачы і пазбаўленнях цяжкую барацьбу ганімага, праследуемага рэвалюцыянера-падпольшчыка, гадамі сядзець у турмах, на катарзе, без сям'і, без блізкіх, без абароны, пад пастаяннай пагрозай крывавай расправы.

Вядома, партыя не была аддзелена непраходнай сцяной ад людзей слабых, хістаючыхся, падвержаных дробнабуржуазным хістанням. Такія людзі таксама пранікалі ў партыю. Але не яны вызначалі твар, маральны воблік партыі. Наадварот, партыя заўсёды вяла з імі барацьбу, ачышчала ад іх свае рады.

У барацьбе за пролетарскую рэвалюцыю, за соцыялізм партыя большэвікоў выкавала дзівоснае пакаленне людзей, здольных на найвялікшыя афяры, здольных усё аддаць, да апошняй кроплі крыві, для перамогі рэвалюцыі. Партыя Леніна—Сталіна выкоўвала такіх людзей, якія здольны ўсё прынесці ў афяру для народа, здольны весці за сабой народныя масы.

Хіба мы маглі-б перамагчы ў кастрычніку 1917 года, калі-б не навучыліся ў Леніна і Сталіна прыцягваць да сябе сэрцы, пачуцці, мыслі мільёнаў працоўных, натхняць іх у маральна на вялікія подвігі. Ворагі-ж былі колькасна ва многа разоў сільней. У іх былі армія, паліцыя, суд, царква, у іх руках быў друк, школа. У іх было больш газет, больш вучоных. Але партыя большэвікоў была ўзброена вялікім вучэннем Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна. Яна выкавала, выхавала ў сваіх членаў такія нормы паводзін у адносінах да ўсіх працоўных, яе праграма настолькі правільна і поўна выражала інтарэсы народа, што яна быстра сумела арганізаваць мільённыя масы для пераможнага штурма.

Іменна гэта несупынная работа партыі большэвікоў прывяла да таго, што ў барацьбе за соцыялізм выпрацавалася надзвычайнае, маральна-палітычнае адзінства совецкага грамадства, адзінства партыі Леніна — Сталіна і ўсяго совецкага народа.

Успомнім першыя годы рэвалюцыі, так выдатна апісаныя Нікалаем Астроўскім у яго аповесці «Як гартавалася сталь». Пяцьдзесят процантаў большэвікоў былі мабілізаваны на франты грамадзянскай вайны. У прыфрантовай паласе былі мабілізаваны ўсе да аднаго комуністы і комсамольцы. Неймаверна цяжкая разруха, холад, недастача ва ўсім, аж да таго, што мы вымушаны былі ствараць такія арганізацыі як «Чэкваламп»! Цяпер многія не ведаюць значэння гэтага слова, а яно азначала: «Надзвычайная камісія па снабжэнню войск лапцямі і валёнкамі»... Вось у такой абстаноўцы, калі працоўныя ў гарадах атрымлівалі сто грамаў хлеба і да таго не кожны дзень, а вельмі часта выдавалася асьмушка чорнага хлеба з мякінай, з аўсом, калі голад, тыф царылі над нашай краінай,—вось у такой абстаноўцы праявіў совецкі народ вялікую маральную мужнасць, каб адбіць блакаду і ваенную інтэрвенцыю 14 капіталістычных дзяржаў, разграміць айчынную і міжнародную контррэволюцыю і будаваць новае жыццё!

Сапраўды, будучыя пакаленні будуць здзіўляцца гераізму совецкага чалавека, які мог прынесці столькі афяр ва імя шчасця новага чалавечага грамадства. Вось гэта вернасць інтарэсам народа, інтарэсам соцыялізма, стойкасць у барацьбе, беззаветная адданасць партыі большэвікоў і гатоўнасць да гераічнай барацьбы за комунізм, гатоўнасць ісці на найвялікшыя афяры, — гэтыя рысы сталі важнейшымі рысамі ў маральным обліку совецкага чалавека.

Большэвіцкая партыя выхоўвае ў працоўных нашай краіны рысы ленінска-сталінскага маральна-палітычнага вобліку.

У сваёй прамове перад выбаршчыкамі таварыш Сталін паказаў, якія патрабаванні ўправе прад'яўляць народ да тых, каго ён аблякае сваім давер'ем. Выбраннікі народа павінны заўсёды аставацца на вышыні пастаўленых перад імі задач; яны павінны быць такімі-ж яснымі і пэўнымі дзеячамі, як Ленін, гэтак-жа, як ён, бясстрашнымі ў баю і бязлітаснымі да ворагаў народа; яны павінны быць свабодны ад усякай панікі, ад усякага падабенства панікі, як-бы складана і небяспечна ні была абстаноўка; яны павінны быць мудры і непаспешлівы пры рашэннях складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўчот усіх плюсаў і мінусаў. Яны павінны быць гэтак-жа праўдзівы і чэсны, як Ленін, любіць свой народ, як любіў яго Ленін.

Таварыш Сталін ярка ўвасобіў у сябе гэтыя ленінскія рысы.

III.

Сярод старых норм паводзін, якія вызначалі і яшчэ сёння вызначаюць у капіталістычных краінах узаемаадносіны людзей, асабліва дзікімі з'яўляюцца адносіны да жанчыны. Там, дзе ля ўлады стаяць эксплаататары, там жанчына — нероўнаправная істота.

У грамадзянскім заканадаўстве капіталістычных краін, у поўнай адпаведнасці з нормамі рэлігіі, асобыя законы абмяжоўваюць права наследвання жанчыны і яе правы на дзяцей, не кажучы ўжо, што ва многіх краінах жанчына пазбаўлена выбарчых правоў. Тысячы гнуснейшых законаў накіраваны супроць жанчыны і ставяць яе ў нероўнаправнае становішча. У капіталістычным грамадстве жанчына ўдвая прыгнечана: працоўная жанчына прыгнечана і як член прыгнечанага класа, і як жанчына.

Але гісторыя рэвалюцыйнай барацьбы ва ўсіх краінах вылучыла выдатных жанчын, паказаўшых, што яны здольны на найвялікшы гераізм, на беззаветную адданасць народу побач і нароўні з мужчынам.

Варта ўспомніць комунарку Луізу Мішэль у Францыі, такіх жанчын, як Н. К. Крупская ў Расіі, французскую комуністку Жанну Лябурб у одэскім падполлі ў перыяд інтэрвенцыі, Даларэс Ібарури і Ліну Одэна ў Іспаніі і многіх гераінь грамадзянскай вайны і соцыялістычнай працы ў СССР.

Наша радзіма дала рэвалюцыі работніцу Марфу Якаўлеву, якая ў час Обухаўскай абароны адна з першых жанчын з асяроддзя пролетарыята, не шкадуючы жыцця, змагалася за справу народа. У нашай краіне выхаваліся тыя жанчыны, якія ў лютым 1917 года вышлі на вуліцу, каб падстаўляць свае грудзі штыкам у барацьбе за вызваленне народа ад царызма.

У агні рэвалюцыйнай грамадзянскай вайны, у холадзе, у голадзе выкоўваліся новыя гераіні. Колькі разоў нашы комуністкі і комсамолкі, беспартыйныя работніцы і сялянкі, верныя рэвалюцыі, стаялі пад дулам нагана ворага. Яны паміралі за рэвалюцыю, за народ.

Роўнасць мужчыны і жанчыны ў барацьбе за комунізм нараджае новыя адносіны да жанчыны. Калі сям'я ў буржуазным грамадстве, у асяроддзі пануючых класаў складваецца на эканамічным разліку, то наша новая, совецкая сям'я складваецца зусім па-іншаму. Новы шлюб адрозніваецца ад ранейшага не толькі тым, што ён не мае патрэбу ў благаслаўленні папа, у благаслаўленні царквы, але і тым, што ў корані змяніўся характар сям'і. Сям'я ў совецкай дзяржаве—гэта сям'я, дзе і муж і жонка эканамічна роўнаправны і ў большасці выпадкаў эканамічна адзін ад аднаго не залежаць. Гэта сям'я, якая сумесна выхоўвае пакаленне новых людзей, будуючых соцыялістычнае грамадства. Гэта сям'я, якая цалкам удзельнічае ў гэтым соцыялістычным будаўніцтве. Гэта новая сям'я!

Часам супроць волі старыкоў-бацькоў, якія прыцяваюцца новым адносінам, іх дзеці ўпітваюць з акружаючага асяроддзя новыя ідэі. Успомнім Паўліка Марозава. Ён бачыў вакол сябе ў сям'і чуждых людзей, але гэты маленькі совецкі грамадзянін ужо быў прапітан ідэямі, мараллю новага века, і ён не спыніўся перад тым, каб пайсці супроць сваёй адсталай, чужой, варожай яму сям'і ва імя інтарэсаў новага, соцыялістычнага грамадства, ва імя новай чалавечай маралі.

Жалкія наследышы прабуюць яшчэ падтрымаць эксплаататарскія адносіны да жанчыны. На жаль, у совецкую літаратуру і нават у кінокатэатры пранікалі такія антымаральныя, антысовецкія творы, як «Закон жыцця» Аўдзеенка і іншыя. Выдаўцы гэтых кніг і фільмаў праглядзелі, што яны маюць справу з варожай спробай абняславіць, апошліць совецкага грамадзяніна, совецкую жанчыну, прынізіць значэнне і вялікую ролю большэвіка, пракладаючага новыя шляхі чалавецтва.

Мы змагаемся і будзем змагацца супроць усіх перажыткаў рэакцыйнай старыны, супроць усіх перажыткаў капіталізма ў сазнанні людзей, супроць бяздушных людзей, роўнадушных да грамадскага зла («мая хата з краю»), супроць эксплаататарскіх пошлых адносін да жанчыны, да сям'і, да дзяцей, супроць хуліганства, супроць рвачоў, лодыраў і летуноў, супроць рэлігійных забабонаў і нацыяналізма ўсіх відаў.

Але трэба бачыць тое выдатнае, вялікае, новае, што выхоўваюць партыя і комсамол, што даюць совецкая здаровая сям'я, совецкая школа, совецкая літаратура, совецкае мастацтва, праца на соцыялістычнай фабрыцы і соцыялістычных палях, што дае ўсё наша жыццё.

IV.

Новы маральны воблік совецкага грамадзяніна выкоўваецца соцыялістычнай працай. Ленін гаварыў, што адна справа зваліць уладу памешчыкаў і капіталістаў — гэта толькі палова задачы, і яна выканана. Капіталіста і памешчыка можна цяпер паказаць толькі ў музеі, больш іх не ўбачыш у совецкім жыцці.

Але другая, труднейшая палова задачы — гэта выпрацоўка новых адносін да працы.

У капіталістычным грамадстве праца з'яўляецца цяжкім брэменем, бо працоўныя працуюць на капіталістаў, а не на сябе. У совецкай дзяржаве патрэбны новыя працоўныя навыкі, новыя адносіны да працы. Бо ў нас цяпер улада знаходзіцца ў руках саміх працоўных, самі яны гаспадары ўсіх прылад і сродкаў вытворчасці.

Але не так проста, не так лёгка выпрацоўваюцца новыя адносіны да працы, новая, соцыялістычная дысцыпліна працы. Не так лёгка выжаць з сябе, скінуць старую псіхалогію. Для гэтага спатрэбіліся годы і годы. Ленін услед за Марксам і Энгельсам не раз гаварыў, што ўзяўшаму ўладу рабочаму класу трэба будзе перавыхаваць не толькі другіх, але перавыхаваць самога сябе, вызваліцца ад радзімых плям капіталізма. Сазнанне чалавечае адстае ад развіцця эканомікі. Эканоміка ў нас новая, соцыялістычная, а сазнанне яшчэ тоіць у сабе перажыткі старыны, рэакцыйныя перажыткі капіталізма, рэлігіі, нацыяналізма, дробнабуржуазную абмежаванасць, цэхавыя настроі. Гэтыя перажыткі прыходзіцца ўпорна пераадольваць, выкарчоўваць.

Для мільёнаў чэсных працаўнікоў совецкага грамадства праца ў СССР стала справай чэсці, справай славы, доблесці і геройства. Выпрацоўваюцца людзі новай, больш высокай, чым у капіталістычным грамадстве, дысцыпліны і арганізацыі працы і больш высокай прадукцыйнасці працы.

Калі паявіліся за граніцай паведамленні аб стаханаўскім руху, то капіталістычная прэса стала распісваць спачатку, што стаханаўцы — гэта якіясьці асобыя людзі, веліканы велізарнай сілы, — толькі такія людзі і могуць, моў, быць стаханаўцамі. Потым, калі стаханаўскі рух стаў масавым, яны прыдумалі новую версію, — быццам стаханаўцам можна стаць толькі на час, на які-небудзь месяц, самае большае, потым выматаеш усе сілы і ўжо перастанеш быць стаханаўцам.

Усё гэта совецкаму чалавеку смешна чытаць. Соцыялістычнае грамадства выпрацоўвае новыя адносіны да працы. Совецкі грамадзянін усё больш і больш пранікаецца сазнаннем, што ён павінен з'явіцца і арганізатарам зусім новых чалавечых адносін і да жанчыны, як да свайго таварыша, і да дзіцяці, як да будучага будаўніка комуністычнага грамадства, і да сваёй працы, да свайго станка, на якім ён працуе, да ўсякай работы, якую ён выконвае ў соцыялістычным грамадстве, да сваёй дзяржавы — першай у свеце соцыялістычнай бацькаўшчыны.

V.

Адной з новых маральных уласцівасцей совецкага чалавека з'яўляюцца яго адносіны да радзімы. Маркс і Энгельс у свой час гаварылі, што пролетарыят не мае бацькаўшчыны. І на самой справе, якая-ж бацькаўшчына ў пролетарыята пры капіталізме, калі яна толькі асуджае яго на найвялікшыя пакуты, пазбаўленні, калі ў гэтай бацькаўшчыны для працоўнага ёсць толькі сродкі падаўлення, калі яна асуджае яго на ўсё яго жыццё на голад, беспрацоўе, яго дзяцей—на бяздомнасць і безнагляднасць, яго дачок—на прастытуцыю!

Іншую мараль у адносінах да сваёй радзімы выпрацоўвае соцыялістычнае грамадства. Мільёны працоўных упершыню заваявалі сваю бацькаўшчыну. Яны былі нічым. Яны сталі ўсім.

У совецкай дзяржаве перад працоўнымі—шырокія, радасныя перспектывы. Перад імі—выдатнае жыццё. Яны набываюць веды не толькі для таго, каб пазнаць свет, але для таго, каб змяніць гэты свет, карэнным чынам яго перарабіць у інтарэсах працоўных. І яны яго зменяць. У нас маладзеюць, пераўтвараюцца старыя, растуць новыя гарады. Замест жалкіх, чахлых сялянскіх палосак неабсяжным каўром раскінуліся квітнеючыя нівы, сады; у пустынях будуюцца каналы, абвадняюцца бясплодныя раней землі. І совецкія людзі бачаць, якой вялікай сілай валодаюць яны з кастрычніка 1917 года, якая гэта магутная пераўтвараючая сіла. Яны любяць сваю радзіму, сваю першую соцыялістычную бацькаўшчыну такой любоўю, якой не мог ніколі любіць працоўны сваю краіну ні ў якую іншую эпоху.

Совецкія людзі паказалі ўзоры вялікай мужнасці і бясстрашша, абараняючы нашу радзіму ў баях з ворагамі СССР.

Такоў совецкі патрыятызм. Адсюль—імкненне совецкага чалавека лятаць вышэй і далей усіх, страляць трапней усіх, працаваць прадукцыйней усіх, вучыцца лепш усіх. Адсюль—вялікі ўсенародны рух стаханаўцаў.

Таварыш Сталін указваў на тое, што ў корані гэтага вялікага руху ляжыць тое, што жыць стала лепш, жыць стала весялей. Жыць стала лепш не асобным членам грамадства, а мільённым масам працоўных. І яны бачаць і ведаюць, што заўтра стане жыць яшчэ прыгажэй, яшчэ весялей працоўным нашай краіны. Яны ўсё больш і больш уясняюць, што «у аснове комуністычнай маралі ляжыць барацьба за ўмацаванне і завяршэнне комунізма» (Ленін). І яны хочуць лепш працаваць над тым, каб ва ўсім свеце, усім працоўным жылося лепш, каб і над імі не было эксплаататараў, прыгнятальнікаў, каб і над імі заззяла сонца соцыялізма.

Совецкі патрыятызм неаддзялім ад інтэрнацыяналізма, арганічна звязан з пачуццём глыбокай брацкай міжнароднай салідарнасці, у духу якой нас заўсёды выхоўвалі і выхоўваюць вялікія асновапаложнікі большэвізма Ленін і Сталін. Працоўныя нашай краіны выпрацоўваюць такія нормы комуністычнай маралі, паказваюць такія ўзоры новых чалавечых адносін, якія ўспрыме ўсё працоўнае чалавецтва і разам з намі, пад адным сцягам з намі будзе будаваць новае чалавечае грамадства.

* * *

Толькі чвэрць стагоддзя, і то няпоўная, прайшла з таго часу, калі чырвоны сцяг соцыялізма, чырвоны сцяг Маркса—Энгельса—Леніна — Сталіна перамог у нашай краіне. Ён пакуль перамог нямногім больш, чым на адной шостай частцы свету. Але ён пераможа і ва ўсім свеце. У капіталістычных краінах бушуе полымя другой імперыялістычнай вайны, а народы краіны Советаў заняты творчай сазідальнай работай, радасна змагаюцца пад вялікім чырвоным сцягам комунізма за новае чалавечае грамадства, упорна працуюць над завяршэннем пабудовы бясклассавага соцыялістычнага грамадства. Працоўныя краіны соцыялізма самаадданa працуюць, усямерна ўмацоўваючы гаспадарчую і абаронную магутнасць нашай радзімы.

20 год назад (2 кастрычніка 1920 г.) Владзімір Ільіч Ленін на III з'ездзе комсамола даваў свае ўказанні аб тым, як павінна будавацца наша комуністычная мараль. Ён гаварыў, што яна ўся павінна быць падпарадкавана інтарэсам барацьбы за комунізм. Усякі свой крок, усякі свой учынак трэба ацэньваць, правяраць іменна з такога пункта гледжання: ці выгадна гэта, ці патрэбна гэта, ці карысна гэта для перамогі комунізма, для справы рэволюцыі? І совецкія людзі робяць правілам свайго жыцця—паступаць заўсёды так, як гэта патрэбна ў інтарэсах соцыялістычнай рэвалюцыі, у інтарэсах комунізма, у інтарэсах поўнай, канчатковай перамогі вялікай справы Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

Ем. ЯРАСЛАЎСКІ.

(«Правда»).



В. І. Ленін на Усерасійскім суботніку ў Крэмлі (1920 год).

З рысунка мастака П. Васільева. Фота-кліше ТАСС.

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ



На трэніровачных стрэльбах у Н-скай часці Заходняй асобай ваеннай акругі. Малодшы лейтэнант А. С. Сідараў правярае правільнасць падрыхтоўкі да стральбы чырвонаармейца Н. Я. Чмехуна.

Фотахроніка БЕЛТА.

У гушчары

Лес здаваўся бязлюдным. Толькі зрэдку налятаўшы парыў асенняга ветру хістаў вяршаліны дрэў, кружыў жаўцеючыя лісты. Прамень сонца не заглядваў у гушчар бору. Тут было поўцёмна і прахладна.

Пачуўся нейкі дзіўны тонкі гук, напамінаючы спевы камара:

— Зумер.

Так і ёсць. Уважліва прыглядзеўшыся, можна было заўважыць скрозь галіны фігуру байца, замаскіраваўшагася ў гушчары. Тэлефаніст сядзеў нерухома, трымаючы трубку каля вуха. Провад бег ад яго тоненькім шнуркам углыб лесу, губляўся ў імху і ялоўцу.

Лёгкі рух павагаў галінкі магутных звваленых дрэў, якія ўтваралі завал. Каля ляжачых на зямлі ствалоў прыталіся стралкі і ручныя кулямётчыкі. У баку пабліскваў стальнымі часткамі станкавы кулямёт. Абараняючыяся падрыхтаваліся да сустрэчы «праціўніка».

Удар адной з рот наступаючага батальёна быў адбіт з вялікімі стратамі для роты. Улічыўшы гэта, камандзір падраздзялення тав. Піскавацкі на подступах да лесу дзейнічаў асцярожна. Ён выслаў разведку, якая ўстанавіла распалажэнне агнявых точак і шматлікіх перашкод на ўзлеску. Байцы падраздзялення хутка перабягалі, камнем падалі, хутка перапаўзалі. Па-майстэрску карысталіся яны лапатай: прыкрываліся ёю ад куль на-бягу і лоўка дзейнічалі, урываючыся ў зямлю.

Прасоўванне роты тав. Піскавацкага падтрымлівалі кулямётчыкі падраздзялення старшага лейтэнанта тав. Александрава.

Асаблівую складанасць у лесе прадстаўляе перамаганне завалаў, якія сустракаюцца на ўсіх дарогах і важнейшых сцежках. Залёгшыя ля завалаў байцы абараняючайся стараны вялі бесперапынны агонь. Перамагаць завалы ўдарам у лоб, наступаць напралом—азначала-б панесці вялікія афяры. І байцы падраздзялення тав. Піскавацкага сталі абыходзіць завалы, імкнучыся ўдарыць у фланг і тыл. Гэта правільная тактыка прынесла багатыя вынікі: абараняючыяся, апасаючыся акружэння і знішчэння, сталі адыходзіць.

Але абарона па-ранейшаму была ўпорнай. Кожную пядзь лесу прыходзілася браць боем, змагацца з засадамі, быць гатовымі да ўсякіх нечаканасцей.

Баючыся контрудару, Піскавацкі дакладна прытрымліваўся свайго маршруту і чотка кіраваў узводамі. У любы момант ён мог зрабіць перагрупоўку, кінуць сілы туды, дзе яны былі патрэбны.

Улічваючы, што падраздзяленне, адарваўшаеся ў лесе ад сваіх, можа быць акружана, камандзір імкнуўся падтрымліваць сувязь са сваімі суседзямі.

«Праціўнік» бесперапынна адыходзіў, не прымаючы штыкавога бою і затрымліваючы наступаючых агнём.

Лес стаў радзець. У прасветах паміж дрэвамі віднелася неба, колерам напамінаючае шынельнае сукно. Наперадзе паказалася бугрыстае поле, а на гарызонце—новы лясны масіў.

Піскавацкі спыніў сваё падраздзяленне, падцягнуў узводы і распалажыў іх паміж дрэвамі. На самы ўзлесак ён не выводзіў байцоў, бо ведаў, што ён з'яўляецца добрым арыентырам для артылерыі «праціўніка».

Пакуль чырвонаармейцы акапваліся, камандзір зрабіў перагрупоўку. Разведчая група аддзялённага камандзіра Зубара незаметна прабралася ў распалажэнне «праціўніка» і ўстанавіла стык паміж падраздзяленнямі. Піскавацкі паслаў з данясеннем чырвонаармейца Ханіна да камандзіра батальёна, які знаходзіўся ў доме лесніка. Атрымаў загад: падрыхтавацца да атакі. Паставіў задачу падраздзяленням. Прысутнічаўшы пры гэтым палкавы камісар тав. Сакэвіч сказаў:

— Цвёрда вазьміце ўпраўленне ў свае рукі, гэта забяспечыць поспех атакі.

Камандзір запомніў гэта ўказанне і стаў ажыццяўляць яго. Узвілася чырвоная ракета. Галасней загаварылі станкавыя кулямёты, накіроўваемыя ўмелай рукой чырвонаармейцаў Лімохава, Захваталава і Фокіна. Яны падтрымлівалі рынуўшыхся ў атаку стралкоў. Выдатна дзейнічалі ручныя кулямётчыкі, якія вялі агонь на-хаду. Артылерыя і мінамёты грамілі абараняючыхся.

Збітыя з вышынь, абараняючыяся адышлі к лесу. Пяхота працягвала наступаць пад прыкрыццём танкаў. Яна рухалася перакатамі ў шахматным парадку. Усё бліжэй і бліжэй узлесак. Са штыкамі наперавес бягуць наступаючыя, залягаюць, страляюць, зноў бягуць. Прымяняюць выпрабаваную тактыку ўдараў у фланг. Узбагачоныя вопытам папярэдняга ляснога бою, урываюцца ў гушчар. Кожны памятае словы наркома тав: Цімашэнка: «Наступленне заўсёды павінна быць рашучым».

С. Хадыка.

Перадавікі баявой вучобы

Яшчэ напярэдадні ўсе ведалі, што падраздзяленне заўтра выходзіць на выкананне задання па баявой стральбе з вінтовак. Стральба — любімыя заняткі маладых чырвонаармейцаў. І яны з нецярпеннем чакалі гэтага задання. Многія хваляваліся, ведаючы, што камандаванне будзе прымаць залік па стральбе.

Хаця яны—артылерысты і асноўны род іх узбраення — гарматы, яны добра ведаюць, што ў сучасным баі артылерысту трэба выдатна валодаць і вінтоўкай. Пераканаўча аб гэтым гаворыць вопыт ваенных дзеянняў на фінляндскім фронце. Успамінаюцца гераічныя подвігі асабовага саставу батарэі Героя Совецкага Саюза, старшага лейтэнанта тав. Маргуліса, які сумеў разграміць белафінскае акружэнне. На такіх прыкладах выхоўваюцца нашы маладыя патрыёты.

Сакратар комсамольскай арганізацыі тав. Глухманюк перад выхадам на стрэльбішча сабраў комсамольцаў. Ён быў упэўнен у высокіх баявых якасцях байцоў-комсамольцаў, але рашыў яшчэ раз напомніць аб адказнасці за выкананне задання.

Комсамольцы ў гэтым падраздзяленні складаюць палову асабовага саставу. І дастаткова кожнаму комсамольцу на «выдатна» выканаць стральбу, як будзе ва многім вырашан поспех усяго падраздзялення. Комсамольцы не забываюць аб тым, што яны важакі. Яны адразу пасля кароткай нарады пайшлі рыхтавацца да стральбы астатніх байцоў. Раніцай палітрук правёў з байцамі гутарку на тэму: «Цяжка ў вывучэнні — лёгка ў баю», у якой расказаў, што азначае гэтая суворaўская пагаворка, прыведзеная наркомам абароны, маршалам Совецкага Саюза тав. Цімашэнка на разборы аднаго тактычнага вучэння.

Вось і стрэльбішча. У далечыні, за 200 метраў, стаяць чорныя кропкі — мішэні. Задача: усе кулі пакласці ў мішэнь, у сэрца «ворага».

Раздалася кароткая каманда — і група байцоў выйшла на агнявы рубеж. Першым справа ляжыць сакратар комсамольскай арганізацыі тав. Глухманюк, радам комсамольцы Міронаў, Тарасаў, Косараў. Уся іх увага ў гэты міг была накіравана на мішэні. Адзін за адным раздаюцца выстралы. Правяраючы падлічыў прабоіны і аб'явіў, што стральба выканана на «выдатна».

Потым стралялі астатнія чырвонаармейцы. Стралялі добра і выдатна.

Радасныя, з вясёлымі песнямі звярталіся байцы са стрэльбішча.

Ва ўсёй баявой і палітычнай вучобе комсамольцы нашага падраздзялення займаюць авангарднае месца. Ля гарматы, у караўле, на тактычных выхадах, на стрэльбішчы — усюды комсамольцы паказваюць прыклады соцыялістычных адносін да вучобы.

Інспектарская праверка паказвае, што наша падраздзяленне гатова пры любых умовах выканаць любую баявую задачу. У гэтым вялікая заслуга комсамольцаў, якія ў падраздзяленні складаюць палову байцоў.

Палітрук **П. Чыкун.**

Майстры гранатамятання

У штурмовым парадку чуваць маладыя звонкія галасы:

— Сорак метраў, сорак тры метры.

Мінута маўчання. Затым драўляная балванка падае на зямлю. Вырываецца крык захаплення:

— Пяцьдзесят метраў!

Гэта чырвонаармейцы першага ўзвода нашай роты Галусташвілі, Баудурэц і Немсідзе трэніруюцца ў мятанні гранат. Яны ўважліва наглядаюць адзін за другім, робяць указанні, крытычныя заўвагі.

— Па дальнасці нядрэнна, — гаворыць Галусташвілі,—цяпер давайце спаборнічаць на меткасць.

Ён глядзіць, як рыхтуецца да браска Немсідзе. Адабрыцельна ўхмыляецца. Немсідзе мякка трымае гранату ў руцэ, у момант браска праносіць яе над плячом і выпускае ў найбольш высокім палажэнні кісці за плячом.

— Точна па настаўленню,—захапляецца Баудурэц.

Так з дня ў дзень дабіваюцца чырвонаармейцы выдатных паказчыкаў. Яны не шкадуюць на гэту справу нават вольнага часу. І ўпорная, сістэматычная трэніроўка дае свае вынікі.

Прыбліжалася паверка. Яшчэ больш напружана, больш арганізавана ішла баявая вучоба. Разам з іншымі байцамі настойліва ўдасканальвалі сваю баявую вывучку тры сябры. Сваім вопытам яны штодзённа дзеляцца з таварышамі.

Калі настаў дзень паверкі, чырвонаармейцы Галусташвілі, Баудурэц і Немсідзе кінулі гранату кожны на 50—55 метраў. Па меткасці адзнака таксама была выдатная. Следуючы іх прыкладу, узоры гранатамятання паказваюць і другія байцы.

Пасля паверкі камандзір узвода сказаў:

— Вывучэнне гранаты і правільнае яе мятанне з'яўляецца адной з важнейшых задач чырвонаармейцаў. Чаму? Таму, што ў баявой абстаноўцы граната з'яўляецца верным прыяцелем байца. У наступленні і абароне—магутным сродкам бліжняга бою. Трэба ўсім стаць майстрамі гранатамятання, падобна тт. Галусташвілі, Баудурэц і Немсідзе.

Простыя словы камандзіра глыбока запалі ў памяць байцоў. Дні, прайшоўшыя пасля паверкі, былі азнаменаваны новымі поспехамі ў гранатамятанні.

Чырвонаармеец **А. Шымароў.**



Снайперы Н-скай часці Заходняй асобай ваеннай акругі чырвонаармеец Д. С. Сырадзе (злева) і малодшы камандзір Н. У. Махітар'ян, выконваючыя стральбу на «выдатна».

Фотахроніка БЕЛТА.



Юныя ленінцы — дзеці вызваленых працоўных у піонерскіх атрадах рыхтуюцца стаць змагарамі за перамогу справы Леніна — Сталіна. На здымку: піонерскі атрад у 12-й польскай сярэдняй школе г. Беластока на чарговым піонерскім зборы. Гутарку вядзе важаты атрада І. Е. Шпрысес.

Фота А. Сапіра.

Палепшыць работу школы

У бягучым годзе ўступіла ў строй новая сталінская школа ў горадзе Бельску, дзе размясціліся 23 класы польскай сярэдняй школы. Знадворны выгляд школы лашчыць вока, але будаўнікі не ўсё зрабілі для поўнага сканчэння будаўніцтва. Да гэтага часу недабудаваны прыбіральні і вадасточныя трубы.

У школе створаны ўсе ўмовы для комуністычнага выхавання дзяцей. Калектыў школы дружна ўзяўся за работу. Асабліва актыўны ўдзел у рабоце школы прымаюць такія настаўнікі, як тт. Баторскі і Яронскі. Гэтыя настаўнікі акуратна рыхтуюцца да ўрокаў, кіруюць гурткамі, вучні па іх прадметах маюць высокую паспяховасць.

Раённы камітэт партыі недастаткова аказвае дапамогі настаўнікам у авалоданні марксісцка-ленінскай тэорыяй. Да гэтага часу ў горадзе няма ні аднаго настаўніцкага гуртка. Інструктары райана Барвінская і Рабіновіч не аказваюць дапамогі ў рабоце настаўнікаў польскай школы.

З боку райана мы маем непрадуманае, голае адміністрыраванне, дзёрганне работнікаў школы. Так, пабыўшы на адным уроку настаўніцы Красоўскай, інспектары заявілі, што настаўніца не ведае матэрыялу. Такое інспектыраванне ніякай карысці не прынесла.

Прывядзем яшчэ больш яркі прыклад нячулага кіраўніцтва райана. Так, 5 верасня, у другой сярэдняй школе змянілі расклад. Завуч школы Златкевіч павінен быў паведаміць аб гэтым пад распіску настаўнікам школы, але ён халатна аднёсся да сваёй работы і не зрабіў гэтага. Настаўніку Яронскаму ў новым раскладзе далі яшчэ адзін урок. Але аб гэтым яму не паведамілі. Настаўнік быў у школе, але не падрыхтаваны да ўрока. Дырэктар школы вызваліў яго ад гэтага ўрока, а райана перадаў справу ў суд. Яронскага асудзілі на 5 месяцаў прымусовай працы.

У педкалектыве няма спайкі і спрацаванасці. Комсорг школы Хуторная, замест дапамогі настаўнікам, падрывае іх аўтарытэт, пытаючыся аб рабоце настаўнікаў у вучняў. А сваю работу з дзецьмі Хуторная пусціла на самацёк.

Патрэбна дапамога совецкіх і партыйных арганізацый, каб згуртаваць калектыў і палепшыць работу школы.

А. Бельскі.

Выдатная кніга

Да апошняга месяца мясцовы чытач не меў навуковага нарыса аб жыцці працоўных Заходняй Беларусі ў перыяд панавання польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Патрэбнасць у такой кнізе была вельмі адчувальная. Зараз, у сувязі з першай гадавінай вызвалення Заходняй Беларусі, выйшла з друку кніга «Заходняя Беларусь пад панскім гнётам» пад рэдакцыяй акадэміка Н. М. Нікольскага і У. Ф. Лочмеля.

У першым раздзеле даецца кароткі гістарычны нарыс, у якім паказана Беларусь на працягу апошняй тысячы год. Беларусь была аб'ектам войнаў і захватаў розных феадальных князёў у XIII стагоддзі, аб'ектам гнёту і страшэннай эксплаатацыі польскімі магнатамі і шляхтай у XIV — XVIII стагоддзях, царскімі крывавымі чыноўнікамі ў 1794—1915 гг., нямецкімі акупантамі ў 1915 — 1918 гг. і польскімі памешчыкамі і капіталістамі ў 1920—1939 гг.

Пасля падрабязнай даведкі аб прыродзе і эканоміцы заходніх абласцей Беларусі, кніга паказвае жыццё прамысловых і сельскагаспадарчых рабочых, становішча сялянства і нацыянальных меншасцей у заходніх абласцях Беларусі пад панаваннем польскіх капіталістаў і памешчыкаў.

Чытаючы гэтыя факты і лічбовыя даныя з нашага былога жыцця, чытаючы аб глумленні і здзеках над працоўнымі, аб страшэннай эксплаатацыі і прыгнечанні працоўных мас у панскай Польшчы, нам становіцца ясным, чаму гэта дзяржава пры першых ударах вайны пацярпела поўнае паражэнне.

Вельмі цікавы чацверты раздзел аб рэволюцыйнай барацьбе працоўных заходняй Беларусі супроць польскіх паноў і капіталістаў. Чытач знойдзе ў гэтым раздзеле многа фактаў геройскага супраціўлення акупантам. Аб гэтых фактах нельга было пісаць у панскай Польшчы і толькі цяпер яны становяцца шырока вядомымі працоўным.

Жыва напісан раздзел аб вялікай гістарычнай падзеі — вызваленні Заходняй Беларусі гераічнай Чырвонай Арміяй.

Апошні раздзел «Першы год будаўніцтва новага жыцця» расказвае, як глыбока ператварылася наша жыццё, як развіваецца наша прамысловасць, як расце асвета, як працоўныя атрымалі ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

Кніга «Заходняя Беларусь пад панскім гнётам» — выдатны дапаможнік настаўнікам і агітатарам.

Г. Златагораў.

Поспехі калгаса імені першага мая

— Ля самага кнышынскага бальшака стаяць новыя будынкі: гэта будзе калгас імені Першага Мая,— так нам тлумачылі ў райземаддзеле, як знайсці дарогу ў калгас.

Мы ішлі так, як сказалі ў райза, і спыніліся ля новых вялікіх будынкаў.

— Гэта калгас?—пыталіся мы ў бабулі, якая пасла авечак.

— Не. Калгас там, — указала яна рукой на поле.

Бабуля, канечна, праўду сказала. Усе калгаснікі былі на полі, на ўборцы бульбы, на малацьбе.

Мы сустрэліся з старшынёй калгаса тав. Браткоўскім. Ён расказвае, што калгас заканчвае малацьбу, і хутка не астанецца ні адной скірды з зярном на полі. Праз 3—4 дні на полі не астанецца ні аднаго клубня. Усе абавязковыя пастаўкі дзяржаве калгас поўнасцю выканаў. Паспяхова заканчвае малады калгас свой сельскагаспадарчы год. Вынікі не малыя. За якіх-небудзь 5—6 месяцаў свайго існавання ёсць што паказаць. Калгаснікі авансам атрымалі па 5 кілаграмаў 200 грамаў збожжа. Сям'я калгасніка Міхаіла Аншчыка атрымала 20 цэнтнераў хлеба, сям'я Владзіслава Чабароўскага—15 цэнтнераў. У сярэднім кожная калгасная сям'я атрымала ад 10 да 15 цэнтнераў збожжа.

Калгаснікі—гэта былыя батракі кнышынскага маёнтка, і столькі хлеба раней яны ніколі не мелі.

— Сваім авансам мы прымусілі замаўчаць нямала ворагаў калгаса,—гаворыць старшыня калгаса. Цяпер зайздросцяць нам суседзі-аднаасобнікі.

Па падліках калгаснікі атрымаюць на дзень яшчэ па 5 кілаграмаў хлеба. Аднак у інтарэсах далейшага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання маладога калгаса неабходна стварыць страхавыя фонды з астатняга ўраджаю. Атрыманы калгаснікамі аванс на працадні цалкам забяспечыць іх хлебам. Райземаддзел павінен аб гэтым падказаць калгасу.

Калгас у першы год свайго існавання разгарнуў вялікае будаўніцтва. У красавіку, як толькі калгас быў арганізаван, была створана будаўнічая брыгада пад кіраўніцтвам вопытнага будаўніка - калгасніка Віктара Каладзея. Брыгада паспела за гэты кароткі тэрмін пабудаваць два свірны, канюшню, кароўнік, свінарнік, дзве кладовых, будуецца яшчэ адна канюшня.

Поспехі калгаса прыкметныя і ў жывёлагадоўлі. Арганізаваны тры жывёлагадоўчыя фермы: малочна-таварная ферма, свінагадоўчая і аўцатаварная фермы. Стада буйнай рагатай жывёлы налічвае 55 галоў, у тым ліку 28 дойных кароў. Ёсць 40 авечак і 36 свіней. Калгасная жывёла і асабістая жывёла калгаснікаў будзе поўнасцю забяспечана кармамі. Загатоўлена 14 скірд сена і адна скірда канюшыны, ёсць 9 скірд яравой і аржаной саломы, акрамя сакавітых і канцэнтрыраваных кармоў.

Поспехі калгаса відаць у паляводстве, у жывёлагадоўлі, у будаўніцтве. А гэта-ж толькі пачатак калектыўнай творчай працы былых батракоў. Праца на сябе, на свой калгас, акрыліла людзей на стаханаўскую працу. Усе 45 працаздольных калгаснікаў штодзённа ўдзельнічаюць у калгасных работах. Большасць з іх значна перавыконвае сваю норму выпрацоўкі і заслужыла пачэснае званне стаханаўцаў. Гэта калгаснікі: Станіслаў Белявец, Антон Белявец, Зігмунд Каладзей, Іосіф Аншык, Станіслаў Бенас і многія іншыя. Раней яны служылі ў памешчыка і не мелі, як гаворыцца, ні кала, ні двара. А цяпер дзякуючы сваёй стаханаўскай працы адчуваюць ужо плады свайго калектыўнага жыцця.

Калгас імені Першага Мая расце і ўмацоўваецца, адкідваючы з свайго шляху рад цяжкасцей. Цяжкасці не палохаюць калгаснікаў: заможнае і культурнае жыццё не прыходзіць само. І гэта жыццё ўжо стукаецца ў дзверы калгаснікаў. Яно адчуваецца ў поўных кладовых з хлебам, у радасных песнях вызваленых людзей, у вольнай працы.

Г. Майсееў.

ГУРТКІ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

За год совецкай улады на вызваленай зямлі заходніх абласцей Беларускай ССР створана вялікая колькасць гурткоў мастацкай самадзейнасці. Арганізаваны драматычныя гурткі на прадпрыемствах, ва ўстановах і ў раённых дамах соцыялістычнай культуры. Працуе таксама рад вясковых гурткоў.

На сённешні дзень у нашай вобласці ёсць каля 60 драмгурткоў (не лічачы школьных калектываў). Рад гурткоў дабіўся добрых вынікаў у сваёй рабоце, як гурток беластоцкага шклозавода, трэцяга тэкстыльнага камбіната, супраслеўскага тэкстыльнага камбіната і іншыя.

Зараз большасць калектываў уключылася ў падрыхтоўку да Усесаюзнага прагляду тэатральнай самадзейнасці. Драмгурток беластоцкага шклозавода рыхтуе для прагляду п'есу «Васа Жэлезнова» Горкага, тэатральны калектыў першага тэкстыльнага камбіната пакажа «Пагранічнікі» Біль-Белацаркоўскага. Гродненскі гарадскі драмгурток падрыхтоўвае п'есу «Без віны вінаватыя» А. Н. Остроўскага. Новыя пастаноўкі рыхтуюць і астатнія калектывы.

З мэтай стварэння кваліфікаваных кадраў грамадскіх кіраўнікоў для растучых і паспяхова развіваючыхся калектываў тэатральнай самадзейнасці беластоцкі абласны Дом народнай творчасці арганізаваў трохмесячныя курсы (з адрывам ад вытворчасці). На курсах займаецца 30 чалавек, адабраных з ліку лепшых кіраўнікоў і ўдзельнікаў драмгурткоў мастацкай самадзейнасці, з іх 16 чалавек з нашай вобласці, 14 — з іншых абласцей рэспублікі.

У праграму навучання ўваходзяць палітграмата, гісторыя тэатра, рэжысура, тэхніка афармлення сцэны і т. д.

У якасці выкладчыкаў запрошаны мясцовыя работнікі мастацтваў.

В. Бемаў.

НАВЕДВАННЕ КАРЭСПАНДЭНТАМ ТАСС АДНОЙ З ЛОНДАНСКІХ ПАЛЯВЫХ БАТАРЭЙ ЗЕНІТНЫХ ГАРМАТ

ЛОНДАН, 3 кастрычніка. (ТАСС). Карэспандэнту ТАСС днямі была прадастаўлена магчымасць правесці ноч у адной з палявых станцый (палявых батарэй) англійскай зенітнай артылерыі, размешчанай у раёне Лондана для абароны сталіцы Англіі ад налётаў германскай авіяцыі.

Гэта батарэя, на ўзбраенні якой знаходзяцца зенітныя гарматы калібрам 3,7 дзюйма, размешчана, як і многія іншыя аналагічныя батарэі, на адным з узвышшаў, складаючых велізарны пояс працягласцю ў некалькі дзесяткаў кілометраў вакол брытанскай сталіцы.

У сярэдзіне невялікага поля збудаван кантрольны пункт. Ён прадстаўляе сабой чатырохвугольную пляцоўку, акружаную мяхамі з пяском, якія ўкладзены на вышыню ў адзін метр. На гэтай пляцоўцы знаходзяцца дакладныя прыборы і тэлефонная будка з бетону.

Зусім блізка расстаўлены поўкругам гарматы. Няммнога далей знаходзіцца каля 15 фанерных домікаў, у якіх жывуць і працуюць 130 чалавек персанала, абслугоўваючага станцыю (батарэю). Па вуглах устаноўлены цяжкія кулямёты для барацьбы з пікіруючымі бамбардыроўшчыкамі. Кожны з гэтых кулямётаў знаходзіцца за агарожай з мяхоў з пяском.

Ужо цямнела, калі карэспандэнт ТАСС прад'явіў свае дакументы для ўваходу на батарэю. Узяўшы пропуск ваеннага міністэрства, прад'яўлены карэспандэнтам ТАСС, камандзір батарэі ветліва прыняў прадстаўніка савецкага друку і паспеў да пачатку паветранай трывогі ў агульных рысах апісаць работу падначаленай яму станцыі.

...Чуецца знаёмае выццё сірэны — «выючай міны», як яе празвалі лонданцы. Глядзім на гадзіннік: звычайны час пачатку начной трывогі. Вячэрняя змена ўжо возіцца каля гармат і кантрольных механізмаў, але яна і зараз не спяшаецца: трывога аб'яўлена агульналонданская, а не мясцовая. Малодшыя камандзіры і сяржанты ў соты раз правяраюць механізмы. Усе салдаты размаўляюць прыглушаным толасам, амаль шэптам. Але раптам дзесьці далёка чуюцца ўзрывы бомб і залпы зенітак. На небе паяўляюцца светлыя плямы, якія блукаюць па воблаках. То тут, то там сярод воблакаў успыхваюць асляпляюча - яркія кропкі. Гэта ўзрывы снарадаў зенітнай артылерыі. Усё гучней чуваць перамяжоўваючаяся гудзенне нябачнага германскага самалёта, які імкнецца прабіцца ўперад праз загараджальны агонь зенітнай артылерыі. Нарэшце, германскі самалёт, відавочна, адмаўляецца ад прамога прарыву і накіроўваецца к Лондану абходным шляхам, у наш бок. Неба асвятляецца праменнямі пражэктараў, але самалёт тым не менш астаецца нябачным.

Раптам збоку раздаецца працяглы сігнал кантрольнай станцыі. Гэты сігнал азначае, што германскі самалёт паявіўся ў сферы дзеяння данай зенітнай батарэі. Адначасова кантрольная станцыя паведамляе па тэлефону прыблізныя каардынаты непрыяцельскага самалёта. Дзяжурны гучна паўтарае лічбы, загадваючы: «Па гуку цэлься!» Жэрлы гармат адпаведна накіроўваюцца ўгору. З тэлескопа і вугламера паведамляюць вутал цэлі: «10.200 футаў», — сігналізіруе аператар. Ад гармат даносіцца металічны лязг. Паўтарапудовыя снарады — на месцы. Астаецца вызначыць трубкі. Тут уступае ў дзеянне зенітная «скрынка тайн» (карэспандэнт ТАСС да яе не дапускаецца) — прэдыктар, або «прадказальнік» — «цуда вышэйшай матэматыкі». Сяржант гаворыць аб ім паважліва: «Ён усё можа рабіць; хіба толькі не сасмажыць яешні». Ля ручак і цыферблатаў прэдыктара працуюць чатыры чалавекі. Па меры апавяшчэння каардынат, яны хутка прыводзяць у дзеянне прыборы і ўносяць папраўкі — на вецер, на хуткасць германскага самалёта і т. д. Усё гэта праходзіць вельмі хутка. Праз тры секунды пасля першага загаду дзяжурнага раздаецца металічны трэск: прэдыктар закончыў падлік і на цыферблаце паявілася лічба. «Трубка 1—7» — крычыць аператар. «Ёсць 1—7», — адказваюць ля гарматы. Праз секунду дулы гармат выкідваюць асляпляюча-жоўтае полымя, раздаецца аглушальны залп; снарады імчацца ўверх, каб прыпыніць шлях непрыяцельскаму самалёту. Праз некалькі секунд становіцца чутным асобны гул узрываў. Гудзенне працягваецца, і зноў паўтараецца той-жа працэс падрыхтоўкі да стральбы і самой стральбы. Аднак на гэты раз адзін за адным робіцца 6 выстралаў, і зноў — залп усёй батарэі. Прыслухоўваемся: гудзенне сціхае. Камандзір урачыста заяўляе: «Самалёт павярнуў і пайшоў у Н-скім кірунку». Сапраўды, хутка пачуліся залпы суседняй батарэі, далей па ўскраіне. Задача батарэі выканана.

У чаканні новага налёту германскай авіяцыі камандзір ходзіць з карэспандэнтам ТАСС у цемры і працягвае свае тлумачэнні. Ён гаворыць, што днямі яго батарэі ўдалося папасці ў германскі самалёт, але ўвогуле ў начной стральбе на батарэі задавольваюцца скромным поспехам — прымусіць непрыяцеля звярнуць з шляху.

Мелі месца камбінiраваныя дзеянні данай батарэі з батарэямі іншых сектараў супроць шматлікіх паветраных «гасцей». У гэты час узнімаецца сапраўдная агнявая заслона. «Тады снарадаў не шкадуем, — гаворыць камандзір батарэі, — у гэтай вайне не ў прыклад мінулай няма недахопу ў боепрыпасах».

Камандзір батарэі паведамляе, што асабовы састаў даверанай яму батарэі сфарміраван нядаўна і большасць салдат знаходзіцца ў арміі ўсяго толькі некалькі месяцаў. Побач з тэтым камандзір з гордасцю гаворыць, што салдаты правялі тры месяцы ў спецыяльнай зенітнай школе і на пробнай стральбе паказалі добрыя рэзультаты: пачалі з 40 процантаў эфектыўнасці і кончылі 90 процантамі.

Тут нас перапыніла новая трывога. Яна працягвалася нядоўга. Аднак два разы прыйшлося спяшаючыся лажыцца на зямлю пад свіст набліжаючагася ў цемры прадмета, аб якім прыходзілася гадаць, што гэта: германская бомба ці асколак англійскай шрапнелі. У 3 гадзіны ночы мела месца апошняя стральба. Яна застала нас ужо на ложках. Раніцай удалося пазнаёміцца бліжэй з салдатамі, якія абслугоўваюць батарэю. Гэта — маладыя рабочыя 23-24 год — гарнякі, транспартнікі, друкары, механікі — з невялікім процантам служачых і некваліфікаваных рабочых. «Хто з вас з'яўляецца членамі профсаюзаў?» — спытаў я ў адной з груп салдат. З 9 салдат 7 адказалі сцвярджальна: двое салдат аказаліся членамі профсаюза гарнякоў (з Паўднёвага Уэльса), двое з'яўляюцца членамі профсаюза транспартнікаў, адзін — саюза маляроў, адзін — саюза пераплётчыкаў і т. д. Гэта мала падобна на мінулую вайну, калі сярод англійскіх салдат можна было рэдка сустрэць членаў профсаюзаў. Не падобна таксама на мінулую вайну абстаноўка — брэзентавыя ложкі, начная нацельная бялізна, паважлівы зварот унтэр-афіцэраў і т. д. Афіцэры батарэй — не кадравыя: камандуючы батарэяй маёр В. з'яўляецца па прафесіі юрысконсультам, яго памочнік — муніцыпальны чыноўнік, лейтэнанты — страхавы агент, інжынер і т. д.

Батарэя яшчэ мае паходны выгляд. Яна толькі некалькі тыдняў на месцы. Гэта, аднак, не адбілася на кухні. Капрал-повар (гарняк, які паходзіць з той-жа вёскі, дзе нарадзіўся вядомы англійскі камуніст старшыня Паўднёва-Уэльскай федэрацыі гарнякоў Хорнер), паказвае мне меню. Раніцай на батарэі выдаюць чай, шатландскую аўсянку і, вядома, англійскі бэкон або з яйкам, або з сасіскамі і т. д. На абед — мясная страва з традыцыйнымі ў Англіі двума карнеплодамі і салодкае. У 17 гадзін — чай, да якога выдаецца хлеб з маслам ці з маргарынам, варэнне ці пячэнне. У 19 гадзін — вячэра. На вячэру выдаюць якую-небудзь мясную страву ці кансервы. Штодзённа на батарэі выдаюць тры чвэрці фунта хлеба, ад трох чвэрцей да фунта мяса, тры чвэрці фунта бульбы, поўфунта іншай гародніны, адна восьмая фунта свежай садавіны. На тыдзень выдаецца 3,5 унцыі (каля адной чвэрці фунта) сліўачнага масла.

Перадаюць, што такіх батарэй, як вышэй апісаная, вакол Лондана некалькі дзесяткаў. Некалькі сот падобнага роду батарэй устаноўлены на англійскім узбярэжжы. Апрача іх, ёсць батарэі з гарматамі больш буйнага калібра — 4,5-дзюймовыя, а таксама мноства больш лёгкіх 40-міліметравых гармат сістэмы «Бофорс». Устанаўленне падобнага роду батарэй, вядома, яшчэ не вырашае здавальняюча ўсёй праблемы абароны Англіі ад начных паветраных налётаў германскай авіяцыі. Аднак, адно несумненна: англійскія ўлады ўжо стварылі сістэму процівпаветранай абароны, у якую трэба ўключыць таксама аэрастаты паветранай загароды і знішчальную авіяцыю. Цяперашняя схема процівпаветранай абароны ў Англіі з'яўляецца значна больш унушальнай з усіх схем, з якімі да гэтага часу прыходзілася сустракацца германскай авіяцыі.

ЗА РУБЯЖОМ

Абвастрэнне адносін паміж Таі і французскім Інда-Кітаем

ШАНХАЙ, 6 кастрычніка. (ТАСС). Па атрыманых верагодных звестках, адносіны паміж Таі (Сіам) і Французскім Інда-Кітаем рэзка пагоршыліся. Улады абодвух краін у тэрміновым парадку адправілі свае войскі да граніц, каб быць гатовымі да ўсякіх выпадковасцей.

НЬЮ-ЁРК, 6 кастрычніка. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Асашыэйтэд Прэс, урад Вішы заявіў, што Таі павялічвае пагранічную ахову на граніцы Французскага Інда-Кітая. Указваецца, што, пачынаючы з 1 кастрычніка, атрады авіяцыі Таі ў саставе 20—40 самалётаў парушылі граніцу Французскага Інда-Кітая. Паводле звестак з урадавых кругоў, французскі ўрад інфарміраваў урад Таі аб тым, што Францыя гатова прадаставіць Таі пэўныя правы на рацэ Меконг. Аднак ён не будзе абмяркоўваць пытання аб агульным пераглядзе граніцы.

БЕРЛІН, 6 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе германскае інфармацыйнае бюро; 50 самалётаў Таі вылецелі з Бангкока (сталіцы Таі) для ўзмацнення пагранічных эскадрыльляў, размешчаных ля ракі Меконг.

ЧУНЦЫН, 7 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе газета «Дагунбао», японскія войскі 5 кастрычніка ўвайшлі ў Ханой і ў Цзялін.

Аглядальнікі заяўляюць аб напружаным становішчы на граніцы Таі і Французскага Інда-Кітая.

Высадка японскіх войск на востраве Люгун

НЬЮ-ЁРК, 8 кастрычніка. (ТАСС). Шанхайскі карэспандэнт агенцтва Асашыэйтэд Прэс паведамляе, што, па маючыхся звестках, японскі флот высадзіў дэсант на востраве Люгун (ля паўночнага ўзбярэжжа Шандунскага паўвострава), у адносінах якога кітайскі ўрад нядаўна прадоўжыў на 10 год арэндны дагавор з Англіяй. Прыбыўшыя з Вейхайвея асобы заяўляюць, што японцы распаўсюджваюць лістоўкі, у якіх гаворыцца, што яны бяруць гэты востраў пад сваё ўпраўленне і не прызнаюць англійскую арэнду, так як гэта дыктуецца ваеннай неабходнасцю.

Некалькі дзён таму назад паблізу вострава Люгун былі заўважаны японскі крэйсер, два мінаносцы і некалькі дапаможных караблёў.

Апазіцыя ўраду Петэна ва Францыі

ВІШЫ, 7 кастрычніка. (ТАСС). Прынятыя французскім урадам у апошні час адміністратыўныя меры расцэньваюцца, як пачаўшаеся наступленне супроць цэнтраў супраціўлення ўраду Петэна. Як ужо вядома, урадам распушчаны многія муніцыпалітэты (у Марселі, Ліёне і т. д.), адхілен ад пасады рад мэраў, у тым ліку Эрыо, арганізаван ваенны трыбунал, які мае паўнамоцтвы выносіць смяротныя прыгаворы. У апошнія дні па рашэнню ўрада адхілены ад сваіх пастоў усе кіруючыя чыноўнікі ў Марселі, у тым ліку начальнік марсельскай паліцыі.

Паводле маючыхся звестак, цэнтрамі апазіцыі ўраду Вішы з'явіліся і часткова з'яўляюцца да гэтага часу Марсель, Ліён, Ніца, дэпартамент Од (паблізу граніцы з Іспаніяй). Тут таксама дзейнічае вялікая колькасць агентаў дэ Голя. Перадаюць, што да самых апошніх дзён марсельская прэфектура рашуча ігнарыравала прадпісанні міністэрства ўнутраных спраў. Агенты дэ Голя трымалі сувязь з Англіяй праз Перпіньян пры актыўнай садзейнасці мясцовай паліцыі. У Ніцы, Кане і іншых гарадах Міжземнаморскага ўзбярэжжа мясцовыя ўлады адкрыта дапамаглі староннікам дэ Голя весці процiўрадавую прапаганду і вербаваць дабраахвольцаў у армію дэ Голя. У дэпартаменце Од большасць мэрый складалася з староннікаў дэ Голя.

Германскія бомбы вялікай узрыўной сілы


БЕРЛІН, 7 кастрычніка. (ТАСС). Стакгольмскі карэспандэнт Германскага інфармацыйнага бюро, датычачыся паветраных налётаў на Англію, піша, што ў апошні час германская авіяцыя пачала прымяняць бомбы велізарнейшай узрыўной сілы. Згодна паведамленняў, атрыманых з Лондана, у раёне докаў Тэмзы ў выніку дзеянняў гэтых бомб мноства будынкаў разбурана дашчэнту. Ад узрыву гэтых бомб рассыпаюцца сцены таўшчынёй у 1 метр. Зваліўшаяся бомба ў раёне аднаго завода амаль поўнасцю разбурыла 30 дамоў.

АФЯРЫ ПАВЕТРАНАЙ БАМБАРДЫРОЎКІ БЕРЛІНА

БЕРЛІН, 8 кастрычніка. (ТАСС). Па паведамленню Германскага інфармацыйнага бюро, у рэзультаце начнога налёту англійскіх самалётаў на Берлін сярод грамадзянскага насельніцтва налічваецца 25 забітых. У мінулую ноч у час бамбардыроўкі каля 60 чалавек атрымала цяжкія параненні.

АМЕРЫКАНСКІ КАРЭСПАНДЭНТ АБ БАМБАРДЫРОЎЦЫ ЛОНДАНА ГЕРМАНСКІМІ САМАЛЁТАМІ

НЬЮ-ЁРК, 8 кастрычніка. (ТАСС). Па паведамленню лонданскага карэспандэнта агенцтва Юнайтэд Прэс, у рэзультаце бамбардыроўкі германскімі самалётамі цэнтральнай часткі Лондана раніцай 8 кастрычніка маецца многа афяр і прычынен вялікі ўрон. Гэта, піша карэспандэнт, адзін з найбольш сур'ёзных налётаў на Лондан за ўвесь час вайны. Жыхары Лондана, якія спяшаліся на работу, падверглiся бамбардыроўцы. Адна бомба ўпала на аўтобус, перапоўнены пасажырамі. Маецца многа забітых. Вялікая колькасць забітых і раненых налічваецца таксама ў іншых раёнах Лондана. Па словах карэспандэнта, да палудня ў Лондане былі аб'яўлены тры трывогі.



Соцыялістычная вуліца ў горадзе Гродне.

Фота А. Сапіра.

АБ СТАЛОВАЙ ГОРХАРЧПРОМГАНДЛЮ

Зайшоў я аднойчы паабедаць у сталовую № 4 Горхарчпромгандлю. Саджуся за стол і чакаю. Праходзіць 5,10... 20 мінут. Нарэшце, паяўляецца афіцыянтка і прымае ад мяне заказ. Ну, думаю з палягчэннем, цяпер яшчэ некалькі мінут — і перада мною будзе стаяць смачная страва. Але што-ж гэта робіцца? Замест таго, каб выканаць заказ, афіцыянтка занялася пабочнымі размовамі, а пасля кудысьці зусім знікла, а я ўсё сяджу і чакаю. Так мінула гадзіна. Калі афіцыянтка вярнулася, то таго, што я заказваў, на кухні ўжо не было.

Тады я, абураны такімі адносінамі, звярнуўся да загадчыка сталовай. Але-ж, па яго словах, аказваецца, што ён мяне «добра ведае як крыкуна і што я заўсёды падымаю шум у сталовай». На самай справе, я першы раз зайшоў паабедаць у гэтую сталовую.

Узнікае пытанне: якая-ж можа быць работа персанала сталовай, дзе загадчык так груба і некультурна адносіцца да наведвальнікаў?

Х. Саламонаў.

—0—

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

„Пабудаваць дарогу ў тэрмін“

Пад такім загалоўкам у нашай газеце 19 верасня гэтага года было змешчана пісьмо тав. Сідачова, у якім указвалася, што кіраўніцтва Гродненскага раёна, у прыватнасці старшыня райвыканкома тав. Пашвенчук, зусім недастаткова займаецца пытаннем заканчэння будаўніцтва дарогі Гібулічы—Квасоўка. Існуе пагроза, што дарога не будзе пабудавана ў тэрмін.

Як паведамляе нам сакратар Гродненскага райкома партыі тав. Кавалёў, пісьмо, змешчанае ў нашай газеце 25 верасня 1940 года, разглядалася на пасяджэнні Гродненскага райкома партыі і было прызнана правільным. Райком прыняў пастанову, у якой намечаны мерапрыемствы па ліквідацыі недахопаў на будаўніцтве дарогі Гібулічы—Квасоўка.

Адказны рэдактар **Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.**

УБ. — 63. Друкарня Беластокдрук.